**УДК 323.1(476) + 94(476) “1929/1939”**

**М.К. Альховік**
Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”, Мінск

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА 1929-1939 ГГ. У БССР І ЯЕ ЎПЛЫЎ НА НАЦЫЯНАЛЬНУЮ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА БССР

**Уводзіны**. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. партыя бальшавікоў абвясціла аб пачатку рэалізацыі ўласнай мадэлі нацыянальнай палітыкі. Пад нацыяй разумелася агульнасць людзей, якая склалася гістарычна і валодала агульнасцю мовы, тэрыторыі, эканамічнага жыцця, псіхічнага складу, культуры. На пачатковым этапе сацыялістычнага будаўніцтва прадугледжвалася стварэнне ўмоў для эканамічнага і культурнага росквіту ўсіх нацыянальных супольнасцей. На дзяржаўныя інстытуты ўскладаўся абавязак ліквідацыі наступстваў русіфікацыі і трансфармацыі “буржуазных” нацый у “сацыялістычныя”. Вылучаліся ідэі прыярытэтнага развіцця раней прыгнечаных нацыянальнасцей. Вырашэнне нацыянальнага пытання звязвалася з эканамічным і культурным адраджэннем нацыянальных ускраін за кошт цэнтральных губерняў і палягала ў забеспячэнні нацыянальнага раўнапраўя, пераводзе дзяржаўных інстытутаў, партыйных і грамадскіх арганізацый на мовы мясцовага насельніцтва, вылучэнні кадраў карэнных нацыянальнасцей на адказныя і кіраўнічыя пасады, стварэнні інстытутаў рэалізацыі правоў і інтарэсаў нацыянальных меншасцей. Важнае значэнне надавалася ўзмацненню нацыянальнай свядомасці, забеспячэнню перавагі карэннага насельніцтва ў складзе пралетарыяту і інтэлігенцыі, развіццю культуры, нацыянальнай па форме і пралетарскай (сацыялістычнай) па змесце. Стратэгічнай мэтай нацыянальнага будаўніцтва аб’яўлялася не абарона і ўмацаванне нацыянальнай і культурна-моўнай разнастайнасці, а яе паступовая ліквідацыя пасля поўнай і канчатковай перамогі камуністычнай фармацыі ва ўсім свеце. Такім чынам, пытанне нацыянальнай ідэнтычнасці з’яўлялася адным з ключавых пры правядзенні нацыянальнай палітыкі.

**Асноўная частка**. З першай паловы 1920-х гг. магістральным напрамкам нацыянальнай работы ў БССР з’яўлялася беларусізацыя, накіраваная на забеспячэнне дамінуючага становішча беларускага пралетарыяту, беларускай мовы і беларускай савецкай культуры ў БССР. Адным з напрамкаў беларусізацыі з’яўлялася ўзмацненне нацыянальнай свядомасці беларускага насельніцтва. Асобныя прадстаўнікі партыйна-дзяржаўнага апарату, беспартыйнай інтэлігенцыі прапагандавалі “бяскласавасць” беларускай нацыі, г.зн. адсутнасць эксплуататарскіх класаў у дасавецкі перыяд, абыходзячы маўчаннем неабходнасць вострай сацыяльнай барацьбы ў перыяд сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР. Адначасова ў БССР існавала буйная сацыяльная група прыхільнікаў асіміляцыі нярускага насельніцтва, прадстаўнікі якой выступалі пад лозунгам “адзінай і непадзельнай Расіі” альбо прыкрываліся ідэалогіяй пралетарскага інтэрнацыяналізму, адмаўляючы існаванне беларускай савецкай дзяржаўнасці, беларускага пралетарыяту і беларусаў як нацыі, неабходнасць падтрымкі беларускай мовы і культуры і інш. [1, с. 23].

Разгортванне фарсіраванага сацыялістычнага будаўніцтва суправаджалася ўзмацненнем каманднa-адміністрацыйных тэндэнцый. У 1929-1930 гг. пад ціскам камісіі ЦКК УКП(б) на чале з У.П. Затонскім кіраўніцтва БССР адхіліла беспартыйную інтэлігенцыю ад кіравання працэсамі нацыянальна-дзяржаўнага і культурнага будаўніцтва. Узмацненне тэмпаў беларусізацыі звязвалася з ліквідацыяй ухілаў ад генеральнай лініі ЦК УКП(б) у нацыянальным пытанні. Перавод партыйна-дзяржаўных, гаспадарчых устаноў, грамадскіх арганізацый, тэрытарыяльных вайсковых адзінак і школ на беларускую мову ажыццяўляўся шляхам правядзення палітыка-ідэалагічных і культурна-масавых кампаній і мерапрыемстваў: месячнікаў беларусізацыі, сацыялістычных спаборніцтваў і ўдарніцтваў па ўжыванні беларускай мовы, рабоце з беларускай кнігай, палітбаёў і палітдзён па нацыянальным пытанні і г.д. [2, с. 268; 3, арк. 416-417].

Адным з вынікаў мадэрнізацыі эканомікі з’яўлялася ўзмацненне працэсаў “беларусізацыі пралетарыяту”. У 1930 г. сярод рабочых цэнзавай прамысловасці беларусы складалі 47,3%, у 1933 г. – 62,4%, у 1934 г. – 63,5%, у 1937 г. – 66% [4, с. 16]. Павелічэнне ліку беларусаў у складзе пралетарыяту было абумоўлена не толькі масавай міграцыяй сельскіх жыхароў, але і пераменамі ў нацыянальным самавызначэнні асобных гараджан, якія ў 1926-1927 гг. запісваліся рускімі [5, арк. 189-190; 6, арк. 45]. У мэтах укаранення беларускай мовы ў паўсядзённае жыццё індустрыйных цэнтраў і ўцягнення рабочых у будаўніцтва беларускай пралетарскай культуры ўлады праводзілі навучанне і папулярызацыю «беларускай мовы, быту, культуры» сярод пралетарыяў. Пры гэтым указвалася на неабходнасць дыферэнцыяванага падыходу да рабочых з пункту гледжання нацыянальнасці, ведаў і гатоўнасці ўжываць беларускую мову, патрабавалі, каб яе вывучэнне і ўжыванне з’яўлялася свядомым і добраахвотным актам [7, с. 97-99].

Вялікая частка насельніцтва падтрымала беларусізацыю, сустракаліся выпадкі пераходу пралетарыяў на беларускую мову. Многія рабочыя ў штодзённых зносінах аддавалі перавагу рускай мове, ужывалі беларускую мову толькі на рабоце (пры неабходнасці). Адначасова сустракаліся выпадкі пагардлівага стаўлення да беларускай мовы і культуры, неразумення беларускай літаратурнай і навукова-папулярнай мовы і публічнай адмовы ад яе ужывання [8, арк. 16, 28-29]. Частка беларусаў успрымала беларускую нацыянальнасць як нешта афіцыйнае, адмаўлялася ад ужывання беларускай мовы [9, арк. 3], адносіла сябе да

“праваслаўных хрысціян”, “рускіх”, “жыхароў Расіі”, носьбітаў “рускай мовы”, альбо да “палякаў”, “каталікаў”, асабліва ў супрацьпастаўленні з іншымі нацыямі [10, арк. 79]. Схіленне да вывучэння і ўжывання беларускай мовы расцэньвалася асобнымі прадстаўнікамі грамадскасці як парушэнне моўнага раўнапраўя [11, с. 50].

Савецкая ўлада праводзіла комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на стварэнне сацыялістычнай культуры. Пры гэтым заставалася адкрытым пытанне культурнай спадчыны мінулага, г.зн. пераемнасці сацыялістычнай культуры з рэвалюцыйна-дэмакратычнымі элементамі традыцыйнай народнай культуры. Ва ўмовах барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам назіралася дэзарыентацыя партыйных, навуковых і культурных работнікаў. Адны з іх заклікалі дыферэнцыявана ставіцца да дзеячаў і твораў мінулага, а другія адмаўлялі практычна ўсю гісторыка-культурную, літаратурную спадчыну, неабходнасць вывучэння фалькору і побытавай мовы: «таварыш, калі пачалася жорсткая барацьба з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, вырашыў, што калі ёсць якая-небудзь кветка, якую насілі беларускія нацдэмы – вышыванку ці слуцкі пояс, то гэта ўжо нацыянал-дэмакратызм». Еўфрасіння Полацкая, Аўраам Смаленскі, Клімент Смаляціч, Кірыла Тураўскі, “манах Францыск Скарына” былі аб’яўлены “рэлігійнымі цемрашаламі” і сярэдневяковымі схаластамі, К. Каліноўскі – “правадыром польскіх памешчыкаў”, Я. Чачот, Ф. Багушэвіч, В. Дунін-Марцінкевіч, А. Пашкевіч, Ядвігін Ш. – “рэакцыянерамі”, “прыгоннікамі”, ухіл да вывучэння сярэднявечча - імкненнем тэарэтычна апраўдаць выхад БССР са складу СССР і распаліць варожасць да пралетарскай Масквы [12, арк. 320].

Палітыка савецкай улады была накіравана на саветызацыю і інтэграцыю нацыянальных меншасцей у адзінае грамадства пры захаванні і афіцыйнай падтрымцы іх нацыянальнай ідэнтычнасці і асаблівасцей. У рабоце з нятытульным насельніцтвам вызначыліся два тэндэнцыі. З аднаго боку, улады БССР захоўвалі курс на ўцягненне мясцовых жыхароў у сферу ўлады і кіравання па прынцыпе прапарцыйнага прадстаўніцтва нацыянальнасцей, стварэнне інстытутаў рэалізацыі правоў і інтарэсаў нацыянальных меншасцей, іх абслугоўванне на роднай мове [13, арк. 149]. З іншага боку, улады БССР узмацнілі інтэрнацыянальнае выхаванне працоўных мас, працэс інтэрнацыяналізацыі ацрелей, прамысловых прадпрыемстваў і навучальных устаноў [14, арк. 54]. У 1924-1934 гг. Белкамзет правёў землеўпарадкаванне да 10 тыс. яўрэйскіх сямей шляхам арганізацыі нацыянальных і інтэрнацыянальных калгасаў, перасяліў на ўсесаюзныя фонды Крымскай АССР 3115 яўрэйскіх сямей, за 1929-1931 гг. накіраваў у ФЗВ, на прадпрыемствы буйной прамысловасці СССР і на чыгунку 3876 чал. [15, арк. 89]. На суцэльныя фонды Бірабіджанскай вобласці ў 1928-29 г. было накіравана 150 чал., у 1930 г. – 70, у 1931 г. – 350, у 1932 г. – 950, у 1933 – 647, 1934 – 909 (нарады для Бірабіджанскай вобласці, у адрозненне ад Крымскай АССР, не выконваліся поўнасцю). Частка перасяленцаў пакінула Бірабіджан, не вытрымаўшы неспрыяльных умоў для жыцця і працы [16, арк. 3].

Нацыянальная палітыка заўсёды адлюстроўвае агульны палітычны курс дзяржавы. Канцэнтрацыя ўладных і эканамічных рэсурсаў, ігнараванне нацыянальнай і рэгіянальнай спецыфікі падчас прыняцця важных дзяржаўных рашэнняў, уніфікацыя грамадскай свядомасці, уласцівыя таталітарным рэжымам, у шматнацыянальнай дзяржаве садзейнічаюць фарміраванню гамагеннага грамадства з разнастайных нацыянальных груп на падставе агульных грамадзянскіх ідэалаў і культурна-моўных стандартаў [17, с. 236]. Сацыяльная і палітычная кансалідацыя, узмацненне сувязей паміж рэгіёнамі і народамі СССР былі магчымыя толькі пры ўмове прызнання дамінуючай і кансалідуючай ролі найбольш шматлікага народа, безумоўнай каштоўнасці яго мовы і культуры. У СССР тэхналогіі вырашэння нацыянальных праблем распрацоўваліся ў саюзным цэнтры, а не ў рэгіёнах, якія валодалі больш дакладнай інфармацыяй пра мясцовыя асаблівасці дзяржаўнага і культурнага будаўніцтва. 14-15 снежня 1932 г. ЦК УКП(б) і СНК СССР аб’явілі аб тым, што “механічная ўкраінізацыя” ва УССР і ў шэрагу раёнаў РСФСР стала легальнай формай для актывізацыі “буржуазна-нацыяналістычных элементаў” і супраціўлення мерапрыемствам улад, выклікаўшы зрыў збожжанарыхтовак [18, с. 698]. 19 снежня 1932 г. была прынята пастанова ЦК УКП(б) і СНК СССР «Аб сельскагаспадарчых нарыхтоўках у Беларусі», накіраваная супраць узмацнення “буржуазна-нацыяналістычных элементаў у БССР, якія прыкрываюцца фальшыва-нацыянальным сцягам” [19, с. 148-149]. Палітыка беларусізацыі і ўкраінізацыі па-за межамі БССР і УССР прызнавалася “спробай з боку аджываючых эксплуататарскіх класаў раней прыгнечаных нацыянальнасцей… выступіць пад фальшыва-нацыянальным сцягам супраць дыктатуры пралетарыяту” і нагодай абвінаваціць ЦК УКП(б) у тым, што “ў радзе абласцей … фактычна не ажыццёўлена раўнапраўе моваў, не праводзіцца ленінская нацыянальная палітыка” [20, арк. 197-198, 216-217].

Да сярэдзіны 1930-х змяняліся палітыка-ідэалагічныя ўстаноўкі кіраўніцтва СССР адносна нацыянальнай палітыкі. Асіміляцыя нацыянальных супольнасцей ва ўмовах сацыялістычнага будаўніцтва аб’яўлялася прагрэсіўнай з’явай і заканамерным вынікам індустрыялізацыі, калектывізацыі, культурнай рэвалюцыі, збліжэння прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту. Між іншым, да 1933-1934 гг. бальшавіцкія ідэолагі абвяшчалі асіміляцыю вынікам нацыянальнага і сацыяльнага прыгнёту, з’явай, не ўласцівай савецкаму грамадству, паколькі сацыялізм будуецца не на нацыянальнай прыкмеце, а на сацыяльным адзінстве пралетарыяту ўсіх краін [21, с. 174-178, 186, 210].

Змяніліся ўяўленні кіраўніцтва СССР аб імавернасці знікнення асобных моў да сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі і ўтварэння адзінай мовы. У адпаведнасці з ідэалогіяй марксізму-ленінізму з’яўленне адзінай мовы (лінгва франка) прадугледжвалася праз доўгі час існавання камуністычнай фармацыі. Гіпатэтычная мова не

атаясамлялася з якой-небудзь мовай – французскай, англійскай, рускай і г.д. У 1929 г., працуючы над артыкулам «Нацыянальнае пытанне і ленінізм», генеральны сакратар ЦК УКП(б) І.В. Сталін прыйшоў да высновы, што да моманту адмірання нацыянальных адрозненняў і моў будуць утварацца занальныя эканамічныя цэнтры «для асобных груп нацый з асобнай агульнай мовай», пры гэтым «нацыянальныя мовы і агульная міжнацыянальная мова будуць існаваць паралельна» (праца ўпершыню апублікавана толькі ў 1950 г.) [22, с. 15]. Аднак у тым жа 1929 г. у адказе на ліст В.Я. Касаткіна І.В. Сталін аднёс апалагетаў дачаснага збліжэння нацый і нацыянальнасцей да няленінскіх кірункаў у марксізме [23, с. 609, 614].

Са снежня 1932 г. у БССР разгарнуўся актыўны пошук антысавецкіх асяродкаў і скажэнняў нацыянальнай палітыкі. 25 лютага 1933 г. «Правда» апублікавала пісьмо настаўніка фізікі і матэматыкі НСШ г. Бобр Крупскага раёна Г.П. Сцяпуры, дзе паведамлялася аб фактах цкавання настаўніка за напісанне запіскі на рускай мове ў сельсавет і за выкарыстанне гэтай мовы ў прыватным жыцці. У пастанове ЦК УКП(б) ад 2 сакавіка 1933 г. «Аб скрыўленні нацыянальнай палітыкі УКП(б) у Беларусі» партыйна-савецкія работнікі БССР былі абвінавачаны ў ажыццяўленні “гвалтоўнай беларусізацыі”, указвалася на недапушчальнасць забароны выкарыстання рускай мовы ў побыце і ў зносінах дзяржаўных або іншых органаў. 14 сакавіка 1933 г. аб’яднаны пленум ЦК і Мінскага ГК КП(б)Б прызнаў факты “голага адміністравання без уліку канкрэтных асаблівасцей кожнага раёна” і “гвалтоўнай беларусізацыі” насельніцтва, якое лічыла рускую мову роднай [24, арк. 317]. У 1933-1934 гг. у рамках масавай палітычнай кампаніі супраць “гвалтоўнай беларусізацыі” былі выяўлены выпадкі выкарыстання метадаў адміністравання пры пераводзе ўстаноў і арганізацый на беларускую мову [25, с. 3-6; 26, арк. 127-135; 27, арк. 248]. 11 ліпеня 1933 г. ЦКК КП(б)Б і РСІ БССР знялі абвінавачванні з прафесара хіміі Прыляжаева ў вялікадзяржаўным шавінізме, які ў 1929 г. адмовіўся ад беларусізацыі [28, арк. 346]. Забаранялася асуджаць і выносіць пакаранні за няведанне і неўжыванне беларускай мовы на працы. Радыкальная змена арыенціраў у нацыянальным пытанні была ўспрынята як сігнал аб згортванні беларусізацыі. Пераход работнікаў і грамадскіх актывістаў на рускую мову абгрунтоўваўся імкненнем пазбегнуць крымінальнага праследавання і адпавядаць новым рэаліям у грамадска-палітычным жыцці. Да мая 1934 г. спыніла сваё існаванне большасць гурткоў беларускай мовы [29].

Ва ўмовах забароны на ўжыванне адміністрацыйных захадаў у 1933-1938 гг. асобныя партыйныя арганізацыі правялі шэраг агітацыйна-прапагандысцкіх акцый у падтрымку “бальшавіцкай беларусізацыі” і вылучэння беларускіх пралетарскіх кадраў. У прыватнасці, у канцы 1936 – пачатку 1937 г. была разгорнута масавая кампанія, накіраваная на ўмацаванне беларускай нацыянальнай самасвядомасці. Яна была прымеркавана да працэсу падрыхтоўкі і прыняцця новай Канстытуцыі БССР і да Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1937 г. У друку раскрываўся вобраз беларусаў, якія ганарыліся сваёй нацыянальнасцю, дзяржаўнасцю БССР, размаўлялі на “роднай беларускай мове”, вучыліся ў беларускіх школах, чыталі беларускія кнігі і газеты, наведвалі пастаноўкі беларускіх тэатраў. У адным артыкуле нават дапускалася, што рускі чалавек, які жыве “ў Беларусі на працягу многіх год, беларускую мову ведае лепш рускай, зрадніўся з беларускай культурай, чытае, піша, пераняў звычаі і традыцыі беларусаў, можа з поўным правам сябе назваць беларусам” [30; 31; 32; 33; 34; 35]. 8 лютага 1937 г. у газеце “Звязда” быў надрукаваны перадавы артыкул, у якім рабілася выснова аб тым, што ў БССР нанесены “сур’ёзны ўдар расхлябанасці і падхалімству, пароджаным спецыфічнымі ўмовамі жыцця беларускага і яўрэйскага народа ў мінулым, местачковасцю”. У адказ 19 сакавіка 1937 г. газета “Правда” ахарактарызавала артыкул як “палітычна шкодны, што скажае ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку” і як “паклёп на беларускі і яўрэйскі народ” [36].

У мадэрнізаваным грамадстве адсутнічае ўласцівая традыцыйнаму грамадству жорсткая рэгламентацыя сацыяльных роляў і стасусу. Законы СССР пакідалі за кожным грамадзянінам права свабодна вызначаць нацыянальную прыналежнасць і родную мову [37, арк. 160]. У адпаведнасці з пастановай аб’яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б ад 22—23 снежня 1933 г. роднай мовай з’яўлялася мова штодзённых зносін [38, арк. 55]. Падчас перапісу насельніцтва 1939 г. растлумачальная работа па пытаннях нацыянальнасці і мовы адсутнічала, што стварала небяспеку дэнацыяналізацыі беларусаў, паколькі ў выпадку слабой самаідэнтыфікацыі асобы яе нацыянальная прыналежнасць вызначалася паводле гутарковай мовы (як гэта было з каталіцкім насельніцтвам у 1934-1938 гг.) [39, арк. 260-308]. Так, у 1938 г. старшыня Вярхоўнага Савета БССР член Бюро ЦК КП(б)Б Н.Р. Грэк змяніла сваё прозвішча на рускае (Грэкава) [40, с. 58].

У 1938 г. беларускія нацыянальныя ваенныя часці і школы былі рэарганізаваны ў агульнасаюзныя з кадравым камплектаваннем. У другой палове 1938-1939 гг. пытанне вылучэння беларусаў на адказныя і кіраўнічыя пасады не ўздымалася. У канцы 1930-х гг. работнікі і грамадскія актывісты былі вызвалены ад неабходнасці валодання беларускай мовай [41, арк. 369, 365], а цэнтралізаваны перавод устаноў і арганізацый на беларускую мову быў абвешчаны контррэвалюцыйнай дзейнасцю, накіраванай на змяншэнне ўплыву рускай мовы і культуры ў БССР [42, с. 78]. У Канстытуцыі БССР 1937 г. адсутнічала палажэнне пра асаблівы статус беларускай мовы. Калі ў 1933 г. кніжная прадукцыя на беларускай мове складала 1102 друк. адз., то ў 1939 г. – 392 (у т.л. перакладная – 205) [43, с. 20-25; 44, с. 64]. Назіралася падзенне папулярнасці адукацыі на беларускай мове. У сярэдзіне 1930-х гг. пачаўся перавод навучальнага працэсу беларускіх школ на рускую мову, у 1938-1939 гг. – афіцыйная рэарганізацыя беларускіх школ у рускія [45, арк. 179-180; 46, арк. 167, 172]. За восем месяцаў 1939 г. доля беларускіх школ зменшылася з 96,75 да 94,33%, вучняў у беларускіх школах – з 93,4% да 88% [47, с. 24; 48, арк. 168]. Савецкая ўлада адмовілася ад захавання дамінуючага становішча беларускай савецкай культуры ў БССР, аб чым сведчыла ліквідацыя Гомельскага драматычнага беларускага

тэатра 8 верасня 1937 г. [49, арк. 10а], дыскрымінацыя беларускіх кадраў Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета ў 1937-1938 гг. і г.д. [50, с. 280, 293, 296-300], пад пагрозай закрыцця знаходзілася беларуская секцыя ССП БССР [51, арк. 114-117; 52, арк. 7-9 зв.] Асобныя партыйна-савецкія дзеячы, прадстаўнікі навукова-педагагічнай і творчай інтэлігенцыі, шараговыя грамадзяне выступілі супраць новай лініі ў нацыянальным пытанні, абвінавачваючы ЦК КП(б)Б у адмове ад беларусізацыі, выцясненні беларускай мовы і культуры, праследаванні беларусаў па нацыянальнай прыкмеце [53, арк.1-2; 54, арк. 160-161].

У сярэдзіне 1930-х гг. прадстаўнікі палітычнай эліты пачалі разглядаць нацыянальныя саветы, школы, калгасы, суды і г.д. у якасці асяродкаў антыдзяржаўнай работы [55, с. 111]. У сярэдзіне 1938 г. ЦК КП(б)Б выключыў польскую мову і ідыш з пераліку моў, якія лічыліся дзяржаўнымі. Абслугоўванне яўрэяў, палякаў, латышоў, літоўцаў і г.д. на роднай мове было асуджана як контррэвалюцыйная дзейнасць. На адказныя і кіраўнічыя пасады прызначаліся толькі асобы рускай, беларускай і яўрэйскай нацыянальнасцей. Канчатковай мэтай дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да яўрэяў і цыган з’яўлялася іх асіміляцыя. Нацыянальныя меншасці, якія мелі дзяржаўныя ўтварэнні па-за межамі СССР, трактаваліся як патэнцыйная пагроза дзяржаўнай бяспецы [56, арк. 173]. У Хрыпялеўскім сельсавеце замест этноніма “палякі” ўжывалася паняцце “католікі” [57, арк. 1]. Да 1940 г. былі ліквідаваны практычна ўсе інстытуты нацыянальных меншасцей. Адны палякі, што атаясамлівалі сябе з навакольным насельніцтвам, арыентаваліся на агульнасаюзную культуру і слаба валодалі польскай мовай, падтрымалі рэарганізацыю. Іншыя прадстаўнікі польскага насельніцтва, якія захоўвалі нацыянальную свядомасць, выкарыстоўвалі ў жыцці польскую і беларускую мовы, выступілі за захаванне польскіх устаноў. Асіміляваныя яўрэі захоўвалі сваю нацыянальнасць, але лічылі немэтазгодным існаванне савецкіх інстытутаў на мове ідыш. Іншыя яўрэі гуртаваліся з прадстаўнікамі сваёй нацыянальнасці, захоўваючы прыхільнасць да традыцыйнай культуры на аснове іўрыта і іудаізму альбо да савецкай культуры на мове ідыш [58, арк. 25-26]. Многія бацькі, настаўнікі і дзеці выступілі супраць рэарганізацыі яўрэйскіх школ. Пісьменнікі, навукоўцы, педагагічныя і культурныя работнікі пачалі кампанію супраць «ліквідацыі яўрэйскай культуры» [59, арк. 47-54].

**Заключэнне**. Такім чынам, у пачатку 1930-х гг. захоўваліся спрыяльныя ўмовы для разгортвання работы па ўзмацненні нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, паколькі магістральным напрамкам нацыянальнай работы ў БССР з’яўлялася палітыка беларусізацыі, накіраваная на пераадоленне наступстваў русіфікацыі, забеспячэнне дамінуючага становішча беларускага пралетарыяту, беларускай мовы і беларускай савецкай культуры ў БССР і трансфармацыю беларускай “буржуазнай” нацыі ў “сацыялістычную”. Аднак да сярэдзіны 1930-х гг. у СССР завяршыўся працэс фарміравання таталітарнага рэжыму, якому ўласцівы курс на фарміраванне гамагеннага грамадства з разнастайных нацыянальных груп на падставе агульных грамадзянскіх ідэалаў і культурна-моўных стандартаў. Пад ціскам ЦК УКП(б) беларусізацыя была згорнута ў 1933-1939 гг., што стварыла рэальную небяспеку дэнацыяналізацыі беларусаў.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Рэзалюцыі Кастрычніцкага Пленума ЦК КП(б)Б. – Менск : Белдзяржвыд, 1930. - 33 с.
2. Трынаццаты зьезд Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Стэн. справ., 30 мая – 12 чэрв. 1930 г. – Менск : БДВ, 1931. – 830 с.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 5440.
4. Гікала, М.Ф. Совецкая Беларусь / М.Ф. Гікала. – Менск : Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б, 1937. – 51 с.
5. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 7747.
6. НАРБ. – Фонд 265. – Воп. 1. – Спр. 2944.
7. Гаруновіч, А. Супроць нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў розных колераў / А. Гаруновіч. – Менск : Белдзяржвыд, 1930. – 101 с.
8. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 4757.
9. НАРБ. – Фонд 15п. – Воп. 4. – Спр. 560.
10. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 8365.
11. Справаздача Менскага гарадзкога Савету рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў XII скліку к перавыбарам Савету XIII скліку. – Менск : друкарня БДВ імя Сталіна, 1931. — 102 с.
12. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 6340.
13. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 5010.
14. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 5013.
15. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 7734.
16. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 6180.
17. Тишков, В.А. Этнополитология: политические функции этничности / В.А. Тишков, Ю.П. Шабаев. – М. : Изд-во Московского унив-а, 2011. – 376 с.
18. ЦК РКП(б) – ВКП(б) и национальный вопрос : сборник : в 2-х кн. / сост. Л.С. Гатагова, Л.П. Кошелева, Л.А. Роговая. – М., 2005. — Кн. 1. : 1933-1945. – 784 с.
19. На крутым павароце. Ідэолага-палітычная барацьба на Беларусі ў 1929-1931 гг.: Дакументы, матэрыялы, аналіз / аўт. – склад. Р.П. Платонаў. – Мінск : НДІДАС, 1999. – 384 с.
20. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 4816.
21. Кнорин, В.Г. Избранные статьи и речи / В.Г. Кнорин. – Минск : Беларусь, 1990. – 303 с.
22. Сталін, І. Нацыянальнае пытанне і ленінізм / І.В.Сталін. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1951. – 19 с.
23. ЦК РКП(б) – ВКП(б) и национальный вопрос : сборник : в 2-х кн. / сост. Л.С. Гатагова, Л.П. Кошелева, Л.А. Роговая. – М., 2005. — Кн. 1. : 1933-1945. – 784 с.
24. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 6352.
25. Пастановы III пленуму гаркому ЛКСМБ, 15-16 сакавіка. – Гомель : б.в., 1933. — 23 с.
26. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 5068.
27. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 5569.

28. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 9164
29. Вигдорович, Ф. Неослабно продолжать борьбу с шовинизмом / Ф. Вигдорович // Правда. – 1934. – 29 мая. – С. 2.
30. Дняпроўскі, С. Узорна падрыхтуемся да Ўсесаюзнага перапісу насельніцтва / С. Дняпроўскі // Звязда. – 1939. – 8 студз. – С. 3.
31. Пытанні нацыянальнасці ў перапісу насельніцтва // Звязда. – 1936. – 27 снеж. – С. 3.
32. Што адкажа Юрый Максімаў на пытанні перапіснага ліста // Звязда. – 1937. – 6 студз. – С. 3.
33. Гасман, Н. Шчаслівая маладосць / Н. Гасман, Ф. Канстанцінаў // Звязда. – 1937. – 8 студз. – С. 3.
34. Саковіч, В. Дачка шчаслівага народу / В. Саковіч // Звязда. – 1937. – 8 студз. – С. 3.
35. Рыбінскі, І. Два перапісы / І. Рыбінскі // Чырвонаармейская праўда. – 1937. – 3 студз. – С. 2.
36. Постановление бюро ЦК КП(б)Б в связи со статьёй «Правды» от 19-III-1937 года под заголовком «Вредная стряпня» // Рабочий. – 1937. – 21 мар. – С. 4.
37. НАРБ. – Фонд 30. – Воп. 1. – Спр. 31.
38. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 6352.
39. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 10870.
40. Лепешаў, І.Я. Сучасная беларуская літаратурная мова: спрэчныя пытанні / І.Я. Лепешаў. – Гродна : ГрДУ, 2002. - 207 с.
41. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 12309.
42. Совецкая Беларусь / пад рэд. В. В. Бедзіна, Ів. Шапавалава і М. Т. Лынькова. – Менск : ДВБ, 1938. – 92 с.
43. Печать СССР в 1928, 1933 и 1934 гг. – М. : изд-во «Крестьянская газета», 1936. – 96 с.
44. Печать СССР в 1939 году. Статистические материалы. – М. : изд-во Государственной книжной палаты, 1940. – 100 с.
45. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13233.
46. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13267.
47. Культурное строительство БССР: Стат. справ. – Минск : Изд. Упр. народнохоз. учета Бел. ССР, 1940. – 112 с.
48. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13267.
49. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 11021.
50. Платонаў, Р.П. Лёсы: гісторыка-дакументальныя нарысы аб людзях і малавядомых падзеях духоўнага жыцця ў Беларусі 20-30-х гадоў / Р.П. Платонаў. – Мінск : БелНДІДАС, 1998 – 326 с.
51. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13225.
52. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13246.
53. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 11638.
54. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13224.
55. Поташ, М.К. 14-годдзю вызвалення БССР ад белапалякаў / М.К. Поташ // Бальшавік Беларусі. - 1934. - № 13-14. - С. 98-11.
56. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 10963.
57. НАРБ. – Фонд 42. – Воп. 1. – Спр. 2131.
58. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13323.
59. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 13230.